# Аляксандр Ганчарэнка першым у раёне намалаціў тысячу тон збожжа



**Першым у раёне намалаціў тысячу тон збожжа Аляксандр Ганчарэнка з ААТ «Жацерава». Летась па выніках уборачнай кампаніі дбайны работнік стаў лідарам сярод камбайнераў.**

Аляксандр Генадзьевіч працуе ў таварыстве на працягу шаснаццаці гадоў.

Удзячнасць за шчырую працу з пажаданнямі далейшага плёну ў хлебаробскай справе выказаў руплііўцу старшыня райвыканкама Дзяніс Колясень:

— Высокія паказчыкі заўсёды дасягаюцца немалымі намаганнямі, і вы з'яўляецеся дастойным прыкладам таго, як трэба працаваць і атрымліваць найвышэйшыя вынікі. Такія шчырыя работнікі —

апора нашай краіны, яе будучае.

Дзяніс Сяргеевіч уручыў падзячнае пісьмо райвыканкама, райкама прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу, падарунак, вымпел і зорачку тысячніка.

Шчыра павіншавалі стараннага працаўніка і ўручылі яму падарункі першы намеснік старшыні райвыканкама, начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Дзяніс Дзішук, дырэктар таварыства Аляксандр Дударэвіч і старшыня райкама прафсаюза работнікаў АПК Тамара Калошыч.

Працу хлебароба ўславілі песнямі работнікі Горкаўскага сельскага дома культуры.

**Надзея БАТАЛКА, фота аўтара**